Маладосць

26.04.2019 1

# Пра маладнякоўцаў-малойцаў

Аксана Ючкавіч

## На хвалі часу, у плыні жыцця

## Праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, часопіса «Маладосць»

---

**Пра маладнякоўцаў-малойцаў**



Непаўторны паэт і літаратуразнаўца Віктар Жыбуль 25 красавіка так сакавіта і па-вясноваму распавядаў пра ТАВІЗ, што захацелася стварыць ТАВІЗ-2, бо і кавярняў у

Мінску хапае, і ўтульных пабаў, дзе за філіжанкай кавы ці за куфлем піва можна шмат чаго наабмяркоўваць у творчай і самай шчырай атмасферы сяброў і адначасова таленавітых творцаў.



Невядома, можа ўслед за "Новымойчанашам" Валерыя Маракова хтосьці б у жарт напісаў "Новыхвалаайцу". Канечне ж, у жарт. Бо чым сябе не пабавіш, калі пачынаюцца цяжкія часы ў грамадстве... А якраз тады (1930-ыя), калі паўстала Таварыства аматараў выпіць і закусіць (ТАВІЗ) — аб'яднанне, так скажам, апазіцыйных афіцыёзу літаратараў, гэтых хлапцоў-ТАВІЗаўцаў і многіх беларусаў чакалі трагічныя моманты, некаторых — смерць.




П.С. Лекцыю пра гісторыю неверагоднага аб'яднання Віктар Жыбуль, вядучы навуковы супрацоўнік архіва-музея літаратуры і мастацтва, чытаў у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры, працягваючы цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных слаўным маладнякоўцам у межах праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця".



Шаноўныя чытачы, такія лекцыі і мерапрыемствы пра разынкі 1930-ых, няхай і з горыччу разынкі, будуць працягвацца і далей. Сачыце за навінамі! Даведайцеся як мага больш пра маладнякоўцаў-малойцаў з дапамогай "праекта чатырох", арганізаванага Нацыянальнай бібліятэкай Бнларусі, Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, архівам-музеем літаратуры і мастацтва і Выдавецкім домам "Звязда", а ў прыватнасці, часопісам "Маладосць".